# Пралеска

## ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ

**№ 5 (69), май, 1997**
**ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС**
**Выходзіць са жніўня 1991 года**
***Заснавальнік: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь***
**220010, Мінск, Савецкая, 9.**


## У НУМАРЫ:


**1.** А. САЧАНКА. **Ліст рэдактара.** Ні дня без вайны

**3. Дзіцячы сад года.** Медуніца *(падборка матэрыялаў)*

**7.** С. ХАМРОТАВА. Медуніца. Характарыстыка выхаваўча-аздараўленчага працэсу

**13.** І.АБРАМОВІЧ. Падарожжа на параходзе. *Канспект заняткаў па матэматыцы ў ІІ малодшай групе*

**14.** Т.СМІРНОВА. Вучымся матэматыцы. *Канспект заняткаў для старэйшай групы*

**17.** Т.БРАГИНА. Лето улыбается. *Сценарий летнего праздника для детей средних и старших групп*

**18.** А.КАЛЕННІКАВА. Ён над вуліцай вісіць... *Канспект комплекснага занятку па азнаямленні з навакольным светам для старэйшай групы*

**19.** Е. ПАНЬКО, А. ВАСИЛЬЕВА. **Блакнот кіраўніка.** Детский сад: проблемы гуманизации

**25. Экапедагогіка.** Картачкі з вывамі жыхароў водна-прыбярэжнай зоны

**34.** І.САЧАНКА. **Што яшчэ пачытаць.** Гульні, забавы, ігрышчы

**34.** Л.МИРОНЕНКО, Н.БУДЧАНИН. **Фотаслова.** Самый "Аленький цветочек"

**36.** С.НІКАЛАЕВА. **Экапедагогіка.** Выхаванне экалагічнай культуры ў дашкольным дзяцінстве

**39. БУСЛЯНКА**. Сямейны клуб

**40.** В. ЧЭЧАТ. **Папараць-кветка.** Беларуская сям'я: сёння і заўтра

**43.** Е.СИВАШЕВСКАЯ. **Вучымся дома.** Такое ли оно раннее — раннее обучение ребенка?

**46.** В.ЗУБОВИЧ. **Паслухаем доктара.** Почему ваш малыш плачет?

**48.** С.ВАРАБ'ЁВА. **Юрыдычны клуб**

**49.** А.СТРАХА, М.СТРАХА. Педагагічная значнасць народнай цацкі

**50.** Г.САЧЕНКО. **Вам на заметку.** Берегите сердце!

**51. Секреты молодости.** Маски для жирной кожи

**51. На нашым стале.** Аб вяршках і карэньчыках

**52.** А.ДЗЕРУЖЫНСКІ. **Чытанка "Пралескі"**. Сонейка працуе

**52.** Н.МЯЦЕЛЬСКАЯ. **Маладзічок.** Вершы

**52.** Уп. КАРЫЗНА. Загадкі


### Прачытай і перадай калегу!

*Шаноўныя нашы чытачы!*

*Перад вамі ў многім абноўлены нумар часопіса "Пралеска". Звярніце ўвагу на яго тэмы, аўтараў, афармленне. Не паляніцеся нам напісаць пра свае ўражанні пра гэты і іншыя нумары нашага выдання.*

*Мы спадзяёмся, што толькі разам з вамі зможам палепшыць "Пралеску".*

*Дарэчы, заканчваецца падпіска на другое паўгоддзе 1997 года. Ужо 2 гады мы не павышаем кошт аднаго нумара часопіса. І ўсё дзякуючы вам, падпісчыкам.*

***Ведайце!*** *Чым больш тыраж часопіса, тым больш магчымасцей зрабіць яго танным!*

*Выпісвайце свой прафесійны часопіс!*

*Пішыце, званіце нам!*

***Заставайцеся з "Пралескай"!***

### ДА ВЕДАМА АЎТАРАЎ!

**За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць пэўныя матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Просім у сваіх допісах паведамляць свой дакладны адрас, тэлефон, прозвішча, імя і імя па бацьку. Рэдакцыя прымае да разгляду рукапісы аб'ёмам не больш як 10 старонак, надрукаваныя праз два інтэрвалы на машынцы ў двух экземплярах, не ўступаючы ў перапіску з аўтарамі.**


**Галоўны рэдактар**
**Алесь САЧАНКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:**

З. А. АБМЁТКА, Г. А. БУТРЫМ, Г. Дз. ДЫЛЯН, В. К. ЗУБОВІЧ, В. І. ІЎЧАНКАЎ, Я. Л. КАЛАМІНСКІ, Т.М.КАРАСЦЯЛЁВА, І.М.КАЧАН, Л.М.КЛЫШКО, З.І.КУСТАВА, Л.П. МАРОЗ, Л.А.ПАНЬКО, В. У. ЧЭЧАТ, Л.І.ЯКУБОЎСКАЯ.

**Мастацкі рэдактар Н. У. Губіна**
**Карэктар Н. І. Міроначык**



Адрас рэдакцыі:
220104, Мінск, Матусевіча, 36, корпус 2.
Тэлефоны: 55-28-94, 55-01-20.

Дзяржаўнае прадпрыемства "Дом прэсы" Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. 220013, Мінск, Б.Хмяльніцкага, 10а.



**© "ПРАЛЕСКА", 1997**



**Рэгістрацыйны нумар 433**

Падпісана да друку з арыгінал-макета 24.04.97. Фармат 60х84 1/8. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум.друк.арк.6,5. Ум.фарб.-адбіт.11. Ул.-выд.арк. 10,9. Тыраж 11200 экз. Цана 11 000 руб. Зак. 753.

Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

Пераносы некаторых слоў зроблены не па правілах граматыкі, а паводле магчымасцей камп'ютэра.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку".



Рэпазіторый БДПУ

*Алена СТРАХА,*
*Мікалай СТРАХА,*
*выкладчыкі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта*

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ЗНАЧНАСЦЬ НАРОДНАЙ ЦАЦКІ

Беларуская народная цацка — гэта дзіўны разнастайны свет, дзе побач існуюць міф і рэальнасць, гістарычныя традыцыі і сучаснасць, інтарэсы дарослых і дзяцей. У цацках своеасабліва адлюстроўваюцца навакольная прырода, побыт, норавы і звычкі народа, дасягненні рамяства і мастацкай творчасці.

У апошнія гады беларуская цацка пачынае паступова ўваходзіць у быт дзіцячага сада, але выкарыстоўваецца пакуль што даволі абмежавана. Звычайна цацка фігуруе як дапаўненне да інтэр'ера групавога пакоя альбо з'яўляецца дапаможнікам на занятках па маляванні і лепцы. Па сваім жа прамым прызначэнні, менавіта як цацка, яна выкарыстоўваецца даволі рэдка. Выхавальнікі не надаюць належнай увагі гульнявой функцыі цацкі. А апошняя выяўляецца ў ёй настолькі выразна, што можна з упэўненасцю сказаць — беларуская народная цацка ніколі не адыдзе з дзіцячага свету.

Чым жа можа прывабіць дзіця беларуская народная цацка, што складае яе педагагічную каштоўнасць? Перш за ўсё, гэта яе маляўнічасць: яркая, выразная, яна прымушае дзіця ўсміхацца і імкнуцца да яе. Размалёўка цацкі, пабудаваная на кантрастных колеравых спалучэннях, успрымаецца вельмі гарманічна і дзякуючы гэтаму яна не ператвараецца ў нешта надакучлівае, непрыемнае для вачэй. Але нават калі беларуская народная цацка зусім не размаляваная (а такое сустракаецца даволі часта), яна працягвае аказваць уздзеянне на дзіцячае ўяўленне сваёй формай, выразнай пластыкай, дасціпнасцю характарыстыкі. Каштоўнай у педагагічным плане з'яўляецца таксама ўмоўнасць мастацкіх вобразаў, іх абагульненасць і пераважная фантастычнасць. Возьмем, напрыклад, цацку "Казак на кані". Здавалася б, майстар, які ніколі спецыяльна не вучыўся майстэрству стылізацыі, павінен быў вылепіць усё "як жывое". А тут ногі ў каня кароценькія, нават і не ногі, а нейкія адростачкі. У конніка ног наогул няма, яны зліліся з тулавам каня. Рукі ў конніка толькі пазначаны ямкамі. Але ў гэтым і ёсць тое сапраўднае адзінства ўласцівасцей матэрыялу і задумы, адпаведнасці форм зместу, якое выпрацоўвалася і ўдасканальвалася не адным пакаленнем майстроў-цацачнікаў. Таму такая ўмоўнасць форм не пазбаўляе цацку вобразнасці і падабенства з натурай. Гэта не засмучае дзяцей, яны добра разумеюць казачнасць і паэтычнасць убачаных вобразаў.

Перад намі вылепленыя майстрам салавей і курыца. Галава, хвост, ногі — усё як быццам аднолькавае, але ж салавей — не курыца. А вось сабака. Галава ў яго наогул адсутнічае, на яе месцы свісток. Але яшчэ не было выпадку, каб дзеці ўсумніліся, што перад імі сабака, бо майстар падкрэсліў самыя характэрныя, самыя істотныя дэталі. Таму вобраз цацкі заўсёды атрымліваўся пераканаўчым, выразным і значным.

Вобразнасць і эмацыянальнасць беларускай цацкі не толькі абуджае думкі і фантазіі дзіцяці, але і заахвочвае яго да перайманbudзьне. Дзіця прываблівае даступная яго разуменню вельмі простая тэхніка выканання народнай цацкі. Таму ў яго ніколі не ўзнікае жадання разламаць цацку і паглядзець, што знаходзіцца ўнутры яе, як гэта здараецца са складанымі фабрычнымі цацкамі. Наадварот, зробленая па самых простых законах тэхнікі і механікі, народная цацка абуджае ў дзіцяці жаданне самому зразумець яе, штурхае яго да вынаходніцтва. Практыка паказвае, што дашкольнікам пад сілу вылепіць і размаляваць шмат розных фігурак, якія потым ахвотна выкарыстоўваюцца імі ў гульнях.

Народная цацка сведчыць аб тым, што народ — тонкі псіхолаг, які добра разумее інтарэсы і патрабаванні дзіцяці. Адсюль так шмат сярод беларускіх цацак прадметаў рухомых і гучальных. Асаблівае месца сярод іх займаюць свістулькі самай разнастайнай формы. Гэта і салоўка, і пеўнік, і баран, і конік, якім можна дзьмуць "і ў хвост, і ў грыву". У старажытны час беларуская цацка акрамя гульнявой выконвала яшчэ і магічную функцыю. Падвешаная над калыскаю дзіцяці драўляная птушка была не толькі забаваю, але і абараняла малое ад "нячыстай сілы". Магічную ролю выконваў і свіст, які паводле вераванняў нашых продкаў адганяў ад дзяцей злых духаў і прываблівaў добрых. Цікава і тое, што, гуляючы з народнай цацкай, дзіця ніколі не выкарыстоўвае яе для адмоўных персанажаў. Відаць, аптымізм і каляровы вобраз цацкі, а таксама добрыя пачуцці, якія яна выклікае, не дазваляюць дзецям бачыць у ёй носьбіта зла.

Мы звыкліся з думкаю, што дзеці гуляюць у рэалістычныя гульні, якія адлюстроўваюць наша сучаснае жыццё, і не надаём дастатковай увагі дзіцячым фантазіям у гульні.

А дзецям фантазія неабходна розная: і проста лялькі ці звераняты, і нешта больш блізкае і роднае нам і нашай гісторыі.

Такім чынам, зварот да народных традыцый у наш час жыццёва неабходны. Дарэчы, гэты працэс ужо даўно пачаўся ва ўсіх краінах свету.



Рэпазіторый БДПУ